**Выкарыстанне прыёмаў візуалізацыі**

**пры вывучэнні слоўнікавых слоў у пачатковых класах**

*Варабей М.І., настаўнік пачатковых класаў кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст" ДУА "Гімназія г.Петрыкава"*

Праблема фарміравання арфагравічнай пільнасці ў вучняў пачатковых класаў заўсёды будзе актуальнай. Кожны педагог ведае, як цяжка малодшым школьнікам вывучаць слоўнікавыя словы, як хутка дзеці томяцца ад манатоннага паўтарэння. Механічнае запамінанне, якое мае пад сабой пасіўную аснову не павышае ўзровень матывацыі вучняў да вывучэння слоўнікавых слоў. А значыць, у працэсе вывучэння беларускай арфаграфіі ў пачатковых класах засваенне слоўнікавых слоў патрабуе асаблівай увагі.

Успрыманне любой інфармацыі пачынаецца з работы органаў пачуццяў. Інфармацыя пэўнага віду паступае да нас звычайна праз адпаведныя аналізатары. Аднак ёсць інфармацыя, якая ўключае розныя кампаненты і можа ўспрымацца адначасова некалькімі аналізатарамі. Вынікі псіхалагічных даследаванняў сведчаць аб тым, што чалавек успрымае інфармацыю пераважна з дапамогай найбольш моцнага аналізатара. Адны людзі лепш запамінаюць зрокавыя, другія– слыхавыя, трэція–рухальныя даныя. Дзеці малодшага школьнага ўзросту авалодваюць рознымі спосабамі запамінання, пры гэтым вырашальную ролю набывае арганізацыя спосабаў запамінання матэрыялу. Важнай умовай высокай прадуктыўнасці памяці з’яўляецца як мага больш эфектыўнае выкарыстанне аналізатараў пры ўспрыманні інфармацыі. Адпаведна, у працэсе работы са слоўнікавымі словамі мэтазгодна выкарыстоўваць сенсаматорны метад, які рэалізуецца праз прыёмы, заснаваныя на сенсорных і маторных дзеяннях, што знаходзяцца ў цеснай ўзаемасувязі. Так, на аснове сенсорнай

інфармацыі, якая паступае ад аналізатараў, ажыццяўляецца дзейнасць, рэгуляцыя, кантроль і карэкцыя дзеянняў. У рабоце са слоўнікавым словамі выкарыстанне сенсаматорнага метаду прадугледжвае актыўную дзейнасць слыхавой, зрокавай і рухальнай (маўленчарухальнай і рукарухальнай) памяці.

Зрокавая памяць звязана “з захаваннем і ўзнаўленнем зрокавых вобразаў”. Як сведчаць вынікі даследавання, праведзенага псіхолагамі, зрокавая вобразная памяць – асноўны від памяці дзяцей малодшага школьнага ўзросту. У сувязі з гэтым эфектыўнасць навучання вучняў пачатковых класаў у значнай ступені залежыць ад развіцця зрокавага ўспрымання, зрокавай памяці.

Лічу, што для запамінання правапісу слоўнікавых слоў эфектыўнымі з’яўляюцца прыёмы, заснаваныя на мнематэхніцы, якія дазваляюць мабілізаваць увагу і памяць навучэнцаў, а паспяховае свядомае запамінанне аблягчае працэс засваення матэрыялу. Выкарыстанне мнеманімічных прыёмаў пры засваенні слоўнікавых слоў прадугледжвае прымяненне малюнкаў, асацыяцый, схем, табліц.

Кожны настаўнік пры рабоце са слоўнікавымі словамі выкарыстоўвае падкрэсліванне пэўнай літары, літар, спалучэння літар, пэўнага склада, у напісанні якіх можна памыліцца. Падкрэсліванне садзейнічае зрокаваму запамінанню слоўнікавых слоў.

Прымяненне прыёму выдзялення пэўных літар колерам, памерам таксама актуальна пры вывучэнні слоўнікавых слоў, якія запісваюцца так, што пэўная літара будзе выдзелена адпаведным колерам, памерам.






Добра выкарыстоўваць слоўнікавыя словы ў рэбусах і красвордах. Дадзеныя прыёмы забяспечваюць актыўную дзейнасць вучняў.

На этапе знаёмства са слоўнікавым словам прапаную выкарыстоўваць рэбусы. У час разгадвання рэбуса, дзеці па-першае папаўняюць свой моўны запас (адбываецца развіццё мовы), па-другое: узнаюць новае слоўнікавае слова, з якім будуць працаваць на ўроках беларускай мовы.

**ТЭЛЕГРАМА**




**СЁННЯ**




Успомніце азбуку, у якой на кожную літару алфавіта дадалі яркі вобраз. Калі патрэбна запомніць літару ў слоўнікавым слове, можна выкарыстоўваць яркія алфавітныя вобразы, якія дадаюць ў слова і звязваюць у яркую асацыяцыю.







Для засваення правапісу слоўнікавых слоў мэтазгодна прапаноўваць вучням зрокавыя апоры – малюнкі. З дапамогай малюнка робіцца акцэнт на літару альбо спалучэнне літар, напісанне якіх трэбы запомніць. Напрыклад:












У час вывучэння слоўнікавага слова можна паказаць гатовыя зрокавыя апоры або прапанаваць вучням прыдумаць свае малюнкі - падказкі. Зрокавае запамінанне слоўнікавых слоў, цікавасць да іх вывучэння забяспечвае ўстанаўленне асацыяцый. Важна, каб асацыіраванне праводзілася шляхам актыўнага ўяўлення, асабліва зрокавага. Напрыклад, прыём “Слова ў слове”

Якая рыба “схавалася” ў слове ВОБЛАКА?

**ВОБЛА**КА




Што “схавалася” ў ПЕНАЛЕ?

**ПЕНА**Л




У час працы над слоўнікавым словам прапаную дзецям рыфмоўку, у якой выкарыстоўваюцца два словы: слоўнікавае і слова –падказка, у якім добра відаць “небяспечнае месца”. Рыфмоўкі невялікія па аб’ёму, займальныя, незвычайныя і таму вучні іх хутка запамінаюць, а бываюць моманты, калі і самі спрабуюць скласці нешта неверагоднае.

**ВОБЛ**ака ціха ў небе плыло,
На **ВОБЛ**у марскую падобна было.

Я **ПЕН**у алоўкам намаляваў,
А потым аловак паклаў у **ПЕН**ал.

**ХВО**ст задраўшы ўгару,
Кот а**ХВО**тна есць ікру.

**ВУ**ж паўзе па **ВУ**ліцы
Да сустрэчы з курыцай.

Атрымалі **ТЭЛЕ**граму:
“**ТЭЛЕ**візар узялі ў краме!”

Усе павінны добра **З**наць,

Як Дом і лу**Ж**у аб’я**ЗДЖ**аць!

Для работы са слоўнікавым словам можна прапанаваць пласцілінавае слова. Вучням патрэбна слоўнікавае слова «напячатаць» з пластыліну. Слова атрымліваецца аб’емным, а дзіця, пакуль его «лепіць», закранае некалькі спосабаў уяўлення: візуальны, кінестычны, лагічны.

Выкарыстоўваю гульню “Фатограф”. Для яе правядзення патрэбна надрукаваць крупным шрыфтам словы на асобных палосках паперы. Вучням паказваецца слова на одну секунду, пасля чаго вучань па памяці яго запісвае. За адну гульню можна паказаць 3—8 слоў. Такая гульня развівае уважлівасць, павышае цікавасць да навучання. А дзеці факусіруюць увагу на слове.

На этапе замацавання, кантроля і самакантроля можна выкарыстоўваць малюнкі са слоўнікавымі словамі для правядзення малюнкавых слоўнікавых дыктантаў.

Зрокавы дыктант – яшчэ адзін прыём для паляпшэння ўвагі, хуткасці чытання, замацавання ведаў. Прапаную вучням 5-6 сказаў, якія ўключаюць у сябе слоўнікавыя словы. За пэўны прамежак часу дзеці павінны прачытаць сказ. Далей сказ убіраецца, а вучні яго запісваюць па памяці. Другі варыянт такога зрокавага дыктанта, калі у сказе слоўнікавае слова заменена на малюнак. Напрыклад:

Ульянка марыла стаць  !

Практыка паказвае, што дзецям 6-8 гадоў часта незразумела, навошта трэба “запамінаць пры дапамозе чаго-небудзь”, калі можна “проста запомніць”. Паслядоўнае ж выкарыстанне аперацый дазваляе вучням не толькі мэтанакіравана і свядома выбраць спосаб запамінання, але і

кантраляваць уласныя мнемічныя працэсы. У сваёй працы я прапаную дзецям алгарытм запамінання слоўнікавых слоў **(**на прыкладзе слова АХВОТНА**).**

**1. Адгадайце рэбус.**

Успомніце асноўныя правілы разгадвання рэбусаў і разгадайце зашыфраванае слова.




**2. Растлумачце значэнне слоўнікавага слова**.

Параўнайце свой адказ з інфармацыяй у тлумачальным слоўніку.

Напрыклад, *ахвотна* - *з ахвотай, з прыемнасцю, з радасцю.*

**3. Звярніце ўвагу на напісанне дадзенага слова.**

Прачытайце слоўнікавае слова па складах арфаграфічна, так, як яно напісана. Вымавіце слова. Параўнайце вымаўленне і напісаннне слова.

**4. Вылучыце ў слоўнікавым слове частку, што выклікае сумненне пры напісанні**. **Выдзеліце яе іншым колерам, або падкрэсліце.**

*У слове АХВОТНА выклікае сумненне спалучэнне літар ХВ.*

*Ці можна праверыць напісанне арфаграмы шляхам падбору праверачнага слова альбо правіла? Праверыць напісанне арфаграмы нельга.*

**5. Параўнайце "небяспечныя" літары з геаметрычнымі фігурамі.**

А — падобна на трохвугольнік, О — на круг, Е — на прамавугольнік. А далей, у патрэбнае слова добаўце фігуры або намалюйце пры дапамозе іх.

**6. Разгледзьце малюнак-падказку**. Як выдзелена арфаграма? Паспрабуйце запомніць малюнак і літару. Закрыйце вочы. Уявіце дадзены малюнак.

**7. Прачытайце гукавую асацыяцыю.**

**ХВО**ст задраўшы ўгару,

Кот а**ХВО**тна есць ікру.

*Яна дапаможа вам запомніць напісанне слоўнікавага слова.*

*Звярніце ўвагу на часткі слоў або літары, якія выдзелены ў слоўнікавым і сугучным словах. Запомніце іх напісанне. Вымавіце ўголас некалькі разоў слоўнікавае слова і сугучныя словы або рыфмоўку. Раскажыце суседу па парце або бацькам.*

**8. Прыдумайце свой малюнак – падказку. Складзіце сваю гукавую асацыяцыю.** Яны дапамогуць вам запомніць напісанне “небяспечнага месца” ў слове.

А **ХВО**ст**,** вусы, чатыры лапы

А**ХВ**отна скачуць па канапе.

**9. Рухаючы вочкамі, напішыце слоўнікавае слова ў паветры.**

**10. Запішыце слова заплюшчанымі вочкамі.** Выкарыстоўвайце аркуш паперы і фламастар або рознакаляровыя ручкі, алоўкі. Разгледзьце, што ў вас атрымалася.

Гэты працэс захапляе навучэнцаў, выклікае станоўчыя эмоцыі, што дазваляе ім больш трывала і з меншымі часавымі затратамі засвойваць вучэбны матэрыял. Такім чынам, мы бачым станоўчую ролю выкарыстання мнеманічных прыёмаў у працэсе запамінання напісання слоўнікавых слоў, якія засвойваюцца лёгка, з цікавасцю і праз сітуацыю поспеху вядзе да новых вяршынь вучэбных дасягненняў.